ПРАВАСЛА́ЎНЫЯ ЖАНО́ЧЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ, жаночыя вучылішчы праваслаўнага духоўнага ведамства, навучальныя ўстановы ў Расійскай імперыі, якія падпарадкоўваліся Свяцейшаму Сіноду. Падзяляліся на 2 катэгорыі: *епархіяльныя вучылішчы* і жаночыя вучылішчы духоўнага ведамства. У 1912 у бел.-літоўскіх губернях налічвалася 5 жаночых вучылішчаў духоўнага ведамства (Мінскае, Полацкае, Парыцкае, Магілёўскае, Віленскае) і 2 епархіяльныя вучылішчы (Спаса-Ефрасіньеўскае у Полацку і Віленска-Марыінскае ў Вільні). Жаночыя вучылішчы духоўнага ведамства — навуч. установы, якія знаходзіліся пад апекай імператрыц і ўтрымліваліся на сродкі духоўна-вучэбнага капіталу пры дапамозе мясцовых епархіяльных сродкаў. Выхоўвалі і давалі адукацыю дзяўчатам у духу правасл. царквы, каб яны сталі дастойнымі жонкамі правасл. свяшчэннаслужыцеляў, добрымі маці і гаспадынямі. Да 1874 мелі назву «жаночыя вучылішчы для дзяўчат духоўнага звання». Ствараліся з 1843, на сучаснай тэр. Беларусі з 1863 (Магілёўскае). Спачатку былі 3-класнымі (па 2 гады ў кожным класе), з 1870-х да 1910-х г. паступова пераведзены на 6-класны курс навучання (1 год у кожным класе) па праграме епархіяльных вучылішчаў. Паводле статуту 1901 у жаночых вучылішчах выкладаліся: Закон Божы, царк. спевы, рус. і царк.-слав. мовы з тэорыяй славеснасці і гісторыяй літаратуры, рус. і ўсеагульная грамадзянская гісторыя, арыфметыка, геаграфія, геаметрыя, дыдактыка з практычнымі заняткамі ў школе, фізіка, неабходныя звесткі па прыродазнаўстве і гігіене, чыстапісанне і рукадзелле. Выпускніцы мелі права на званне хатніх настаўніц. Паводле спец. «Палажэння аб сёмым дадатковым педагагічным класе пры Епархіяльных жаночых вучылішчах ад 1907 былі адкрыты 7-я класы ў Парыцкім, Полацкім, Магілёўскім і Мінскім жаночым вучылішчах. У 1910 у Парыцкім вучылішчы адкрыты 8 клас, які даваў выпускніцам права паступаць у Пецярбургскі пед. інстытут. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 П.ж.в. скасаваны. *С.М.Васовіч.*